№7
17 чэрвеня пятніца
Кошт 150 руб.

ЦЭНТРАЛЬНАЯ ГАЗЕТА

ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ

ЗДАРОВЫ СЭНС

ГОНКА ЦІ РЫНГ?

Хто ёсць хто

Заканчваецца апошні раунд выбарчага паядынку. У адрозненне ад спартыўных спаборніцтваў, дзе зала мала ўплывае на судзейскі вердыкт, прэзідэнцкі турнір судзяць гледачы. Нехта з нас даўно зрабіў свой выбар, камусьці ён даецца цяжка, але нікому не пашкодзіць лішні раз падумаць і ўзважыць сваё рашэнне. Галоўнае — не памыліцца.

У палітыцы, як і на нашым дзікім рынку, існуе пастаянная небяспека падмены. Сэнс падмяняецца фразай, змест — упакоўкай, пазіцыя — позай. Моцны,пераканаены ў сваіх мэтах чалавек рэдка гуляе ў маскарад. Яго паглынае Справа. Глядзіцца ён, магчыма, не заўсёды эфектна, але натуральна і пераканаўча, бо ад яго ідзе адчуванне ўнутранай сілы і надзейнасці.

Слабасць шукае для сябе прынадную маску. Гэта адзіны спосаб прыкрыць няздатнасць. І таму не варта здзіўляцца, калі выходзяць на публіку карнавальныя постаці — і злавесныя, і камедыйныя, але аднолькава хадульныя, засяроджаныя на ўласнай персоне. Глядзіш, і з"явіцца на тэлеэкране "місіянер" у берэце дэсантніка: фанатычны агеньчык уваччу, нягнуткая вертыкаль, тон касцельнага прапаведніка... Альбо выскачыць, як Піліп з канапель, пенсійнага ўзросту натужліва бадзёры балака... Ці, нарэшце, пагрозліва насунецца і загрыміць вясковага пакрою граф Монтэ-Крыста... Розныя амплуа, але адна палітычная школа: крыклівы напор і поўная глухата на аргументы праціўніка.

Сярод кандыдатаў у прэзідэнты, бадай, найменш "паказушны" і тэатральны Вячаслаў Кебіч. У яго здараецца лёгкі налёт бравады, але замешана яна, хутчэй, на гумары. Часам мільгане хітраватая ўсмешка, але гэта не больш чым запрашэнне да адкрытай і вострай размовы. Іншы раз у палемічным запале змяшчаецца націск на асабовыя займеннікі: "Я бяру на сябе адказнасць... я ўпэўнены... я буду стаяць на сваім..." У гэтым ёсць пастава, няма, аднак, апломбу. І адкуль яму быць, калі кожны дзень пачынаецца і сканчваецца ў безупынных пошуках адказаў на набалелыя пытанні.

Радыкалы празвалі ўрад "пажарнай камандай": з большым ці меншым поспехам ён тушыць гарачае вуголле, але жыве падзёнкай — ад аднаго трывожнага званка да другога...

Тушыць трэба. Іскры ад гайдараўскіх эксперыментаў разляцеліся ва ўсе бакі, пагражаючы спапяліць нас дашчэнту. Але няпраўда, што ўрад згубіў перспектыву. Ён здолеў уберагчыся ад дзвюх аднолькава небяспечных крайнасцей — "гайдарызацыі" і "украінізацыя" У першым выпадку заціскаюцца дзяржаўныя крэдыты і датацыі, што вядзе да непазбежнага і хуткага развалу вытворчасці, у другім — гаспадарка напампоўваецца пустымі грашыма, што руйнуе і нішчыць фінансавую сістэму.

У Маскве збіраліся ісці ў рынак са сваёй валютай, але без тавараў, у Кіеве — з таварамі, але без уласнай валюты... Гучыць абсурдна, але колькі мінула часу, пакуль гэты абсурд пачалі ўсведамляць на ўрадавым узроўні.

Мы рухаліся няроўна, звіліста, на хаду ўдакладнялі арыенціры, але ўрэшце знайшлі сваю лінію. Шумныя выбарчыя баталіі неяк засланілі ад нас сапраўдную падзею: з дапамогай незалежных экспертаў кабінет міністраў распрацаваў пакет дакументаў, якія забяспечаць прарыў на галоўным напрамку — у галіне інвестыцый. Дзяржава не толькі стварае аптымальныя ўмовы для прыватных інвестараў, як айчынных, так і замежных, але дае гарантыі ад палітычнай рызыкі. Капіталаўкладанні — гэта структурная перабудова эканомікі, новыя рабочыя месцы і рэальнае папаўненне бюджэту. З імі звязаны шанцы вытворцаў і гуманітарнай інтэлігенцыі, пенсіянераў і моладзі. Шанцы выхаду краіны на траекторыю нармальнага развіцця.

Разам з паглыбленнем эканамічных сувязей з Расіяй актыўная інвестыцыйная палітыка збудуе падмурак нашага дабрабыту і ўмацуе грамадзянскі мір. На гэтым трымаецца перадвыбарная праграма Вячаслава Кебіча. Яе змест — гэта чатыры ТАК і чатыры НЕ. Змешаная эканоміка, сацыяльная абарона, саюз з Расіяй і народная згода — так! Дзікі рынак, шокавыя рэформы, нацыяналізм і русафобія, палітычныя ганенні і забароны на прафесію — не!

Прадстаўнікам нацыянал-радыкальнага лагеру ў гэтых лозунгах знаёма кожнае слова, але чытаюцца яны з дакладнасцю "да наадварот". Плюс ператвараецца ў мінус, мінус — у плюс...

У Рыгора Барадуліна ёсць іранічныя радкі, якія сёння падаюцца за чыстую манету: "Хто вінны, хто нявінны, усе крычаць павінны: "Упэўненых зрабі з нас, жалезны містэр Бізнес!" Навошта ратаваць і падтрымліваць айчынных прамыслоўцаў і аграрыяў? Не трэба, адказваюць Зянон Пазьняк і Станіслаў Шушкевіч. Усё вырашыць рынак. Знікаюць з паліц магазінаў беларускія вырабы? Не бяда. У "камках" багаты выбар імпарту.

Магчыма, нехта спытае: на якія заробкі людзі змогуць купляць замежны мадэрн? Ніякі фірмач не разлічвае на шэрую публіку. Ён працуе на элітарнага пакупніка, які нядбайным рухам кідае заморскія пакеты ў багажнік свайго "мерса"...

Сёння тры чвэрці дзяржаўных крэдытаў аддаецца сялу, але паплечнік былога спікера, наш галоўны банкір Станіслаў Багданкевіч, якога называюць "ценявым прэм"ерам", абяцае спыніць бюджэтныя ўліванні ў сельскую гаспадарку. Прыдушаная неймаверными цэнамі на тэхніку і энергарэсурсы, яна пакуль неяк барукаецца. Адзін вясковец корміць трох-чатырох гарадскіх жыхароў, але пакіньце яго без падтрымкі, і ён сам ледзь выжыве.

Капіталізатараў гэта мала хвалюе. Не будзе свайго хлеба і сала, дык купім у Канадзе ці Галандыі. Ёсць і дэсерт: бананы растуць на асфальце... Амерыканскія вучоныя мяркуюць, што бананавая дыета добра ўплывае на інтэлектуальныя і валявыя якасці лідэраў. Але нашым дамарослым гайдараўцам нішто не дапаможа. Цяжкі выпадак...

Японцы задумалі пабудаваць раскошны атэль для іншапланецян у выглядзе лятаючай талеркі. Рэфарматары-разбуральнікі нічога не будуюць, але спадзяюцца, што з Захаду прыляцяць лятаючыя талеркі, да краёў запоўненыя доляравай дапамогай... У прадчуванні цуду яны не губляюць час і, на колькі хапае сілы, стараюцца падарваць славянскае адзінства. Адзін гэта робіць адкрыта, другі цішком, у сваёй звычайнай інтрыганцкай манеры, але і Пазьняк, і Шушкевіч бачаць звышзадачу ў тым, каб перашкодзіць збліжэнню з Расіяй.

Здавалася б, пачаткоўцу зразумела, дзе ляжаць нашы жыццёвыя інтарэсы, аднак высакалобая апазіцыя разварочвае аглоблі ў процілеглы бок. У выніку нараджаецца дзівосны пазьнякоўскі шэдэўр: " Нашы палітычныя і эканамічныя партнёры — на захадзе, а рынак — на ўсходзе".

Шаленства мае сваю методу. Нацыяналісты былі і засталіся перакладчыкамі чужых думак. Іх суперклопат — патрапіць і дагадзіць заходнім апекунам. Спонсараў можна зразумець. Яны ніяк не пазбавяцца ад застарэлага комплексу страха перад былым еўраазійскім гігантам. Яны хацелі б не скараціць, а, наадварот, максімальна павялічыць дыстанцыю паміж садружнымі рэспублікамі. Ім увесь час мроіцца, што можа зноў паўстаць з нябыту вялікі Саюз...

На пачатку чэрвеня ў Боне адбылася прэм"ера оперы Франца Хумера "Гарбачоў". Чакалі прыезду галоўнага "віноўніка" тэатралізаванай падзеі (вядома, з Раісай Максімаўнай). Газеты ажыўлена абмяркоўвалі фантастычна высокія цэны білетаў — ад 750 да 10.000 марак, прычым уся выручка паступала на рахунак фонда апошняга прэзідэнта СССР, а, дакладней кажучы, першага магільшчыка СССР. Аднак Гарбачоў не прыехаў.

Што запыніла "вернага ленінца"? Жорсткая сцэнічная праўда. Дзеянне выстраена пад рэпетыцыю. Рэжысёр і суфлёр безупынна падказваюць двайніку Гарбачова словы, інтанацыю, тэксты. І той старанна выконвае каманды. Як было ў рэчаіснасці і як сёння здараецца з нашымі манекенамі. Вядома, не той маштаб, але тая ж гатоўнасць азірацца на суфлёрскую будку...

Аляксандр Лукашэнка, які атрымаў ганаровае званне "заслужанага папуліста", ніколі, як быццам, не меў ніякага дачынення да ультранацыяналаў. Не хто іншы, як ён разам з групай членаў Вярхоўнага Савета ездзіў летась у Маскву і заклікаў расійскіх парламентарыяў неадкладна ўтварыць канфедэрацыю. І раптам пазіцыя народнага дэпутата крута перамянілася. Як паведаміла прэса, на сустрэчы з выбаршчыкамі ў Гродна Лукашэнка негатыўна ацаніў аб"яднанне грашовых сістэм Расіі і Беларусі, назваў яго фарсам і "антынароднай акцыяй".

Што здарылася? Адкуль гэты нечаканы паварот на 180 градусаў? Пры ўсёй імпульсіўнасці і непрадказальнасці Лукашэнкі не хацелася б мірыцца з яго кульбітамі. Дагэтуль у нас толькі адзін дзеяч — былы спікер — меў права на палітычныя зігзагі і шараханне з боку ў бок...

Каманда Лукашэнкі зразумела, што трэба давярнуць да 360-ці градусаў і ўзнавіць пабляклы вобраз барацьбіта за славянскую ідэю. Пашанцавала. Яму далі магчымасць выступіць у расійскай Дзяржаўнай думе. У сваёй прамове Лукашэнка выказаў (і зусім шчыра!) глыбокія сімпатыі да рускага народа, але неяк непрыкметна для сябе зноў пачаў нападаць на маскоўскі дагавор.

І вельмі ўдала дапоўніў аргументы сваіх непрыяцеляў- нацыяналістаў. Тыя крычаць: "З кім аб"ядноўваемся? У Расіі хаос, занепад, улада мафіі!.." А Лукашэнка ўшчуваў расійскіх думцаў: "З кім аб"ядноўваецеся? На Беларусі развал, павальнае грабежніцтва, разгул нацыяналізму!.." У выніку атрымаўся адмысловы тандэм. Што зробіш! Гэта вядома даўно: пойдзеш налева — прыйдзеш направа, калі не бачыш нічога, акрамя ўласных амбіцый.

Не, Лукашэнка, канешне, быў бы не супраць дамовы з Масквой, калі б пад ёй стаяў яго подпіс. Але там подпіс Кебіча, і перажыць гэткае, пагадзіцеся, цяжка. Тут не да прынцыпаў!..

Аляксандр Рыгоравіч — па-свойму ўнікальная з"ява ў палітыцы: рэдкае спалучэнне ўчэпістай вынаходлівасці з поўным наівам. Яго эканамічная платформа (яна, дарэчы, мала чым адрозніваецца ад дэкларацый А.Дубко і В.Новікава) можа служыць хрэстаматыйным прыкладам папуліцкай пустышкі.

Лукашэнка збіраецца, напрыклад, загадаць прадпрыемствам, якія апынуліся ў прастоі, неадкладна запусціць станкі і канвееры. Пачне, скажам, Мінскі трактарны гнаць машыну за машынай, і што з гэтага? Заводская тэрыторыя і так забіта трактарамі, якія не знаходзяць збыту з-за іх высокага кошту. Адзінае выйсце — загадаць спажыўцам рабіць з паветра грошы і купляць... Другі, не менш смелы, праект — замарозіць цэны. Хіба незразумела, чым гэта скончыцца? Суседзі, якія сядзяць на інфляцыйнай спіралі, вымятуць нашу прадукцыю, пакінуўшы нам пустыя паліцы.

Кажуць, калісьці, у гады нямога кіно, сцэнарыі многіх фільмаў запісвалі на манжэтах накрухмаленых кашуль. Так сёння пішуцца некаторая прэзідэнцкія праграмы. Толькі манжэты ад розных кашуль...

Адзінай казырнай картай Лукашэнкі стала шумная і задзірыстая барацьба з карупцыяй. Праўда, яе спрабуюць перахапіць і Пазьняк, і Шушкевіч (хоць на апошняга Аляксандр Рыгоравіч прызапасіў салідны кампрамат). На гэтым можна зарабіць ачкі, але рана ці позна людзі спытаюць: чаму няма канкрэтных доказаў? Адно цьмяныя намёкі і безадрасныя пагрозы. Ці не лепш ажыццявіць урадавы план вяртання ценявых грошай у вытворчасць? Калі спыняцца спекуляцыя і ўцёкі ад падаткаў, то парвуцца повязі паміж мафіёзным камерсантам і прадажным чыноўнікам.

Экстрэмісты папярэдзілі, што з прыходам да ўлады пачнуць ператрэсваць і разганяць кадры. Праўда, Лукашэнка злітаваўся і паабяцаў, што пусціць "пад нож" не больш як 15 працэнтаў службоўцаў. Затое бэнэфаўская "Свабода" параіла праціўнікам запасацца зубнымі пратэзамі: калі не пасадзяць за краты, то зубы выб"юць напэўна...

Не адстае ад сваіх ідэйных сяброў і наш высокамаральны прафесар. Мы памятаем, як Станіслаў Станіслававіч пляскаў у далоні, калі ў Маскве расстралялі з танкавых гармат Вярхоўны Савет. Былы спікер — адзіны сярод дзеячоў СНД! — радаваўся крывавай развязцы... Першым сваім дэкрэтам ён намерыўся звальняць і гнаць усіх, хто не падзяляе яго дэмакратычных пачуццяў. У танк не залезе, але мятлой пашоргае!

Нам патрэбны разборкі ці грамадскі мір? Эксперыменты на выжыванне ці нармальнае жыццё?.. Выбары не сляпая латарэя, а наш свядомы выбар.

Ігар ДЫЛЕЎСКІ





ПУЛЬС

ГОЛОСОВАНИЕ НАЧАЛОСЬ

Считанные дни остаются до выборов первого президента Республики Беларусь. В голосовании, как сообщил секретарь Центральной избирательной комиссии И.Лихач, имеют право принять участие более 7 миллионов 300 тысяч человек. Готовы к выборам по республике 6880 избирательных участков. На некоторых из них голосование уже началось. Голосуют сегодня те, кто не сможет по каким-то причинам принять участие в выборах 23 июня. 23 июня объявлен выходным днем.

"ЗОЛОТОМУ ЮБИЛЕЮ — ДОСТОЙНУЮ ВСТРЕЧУ"

Под таким девизом трудится в эти дни 32-тысячный коллектив Минского автомобильного завода. Коллектив предприятия за 50 лет своей деятельности собрал свыше 1 миллиона 161 тысячи автомобилей разных моделей и около 443 тысяч штук прицепной техники. Встречая юбилей хорошей работой, не забывают на МАЗе и о социальных вопросах. Так, в этом году уже сдан "под ключ" 144-квартирный дом, строительство еще одного — на 72 квартиры — будет завершено в июле-августе. Ведется также строительство двух домов на 236 квартир. К услугам автозаводцев своя поликлиника, Дворец культуры, лагерь труда и отдыха для детей...

А.СТЕПАНОВ

НАШЫ Ў ЯРАСЛАЎЛІ

Нашага славутага земляка Максіма Багдановіча ведаюць не толькі ў Беларусі. Сведчаннем таму з'яўляецца і музей славутага паэта, што ўжо тры гады працуе ў рускім горадзе Яраслаўлі, з якім у жыцці М.Багдановіча звязана было вельмі і вельмі шмат. А нядаўна тут на Краснай плошчы быў устаноўлены помнік паэту. На адкрыцці яго прысутнічала беларуская дэлегацыя, прадстаўнікі творчай інтэлігенцыі горада.

НА ПЛЁНЦЫ — ЗНОЎ ВАЙНА

Хутка на кінастудыі "Беларусьфільм" пачне здымацца мастацка-публіцыстычная кінастужка "Генерал фон Зайдлец".

Гэты фільм — расказ пра чалавека, якому лёсам было наканавана стаць адной з найбольш трагічных фігур той вайны. Ён быі членам камітэта "Свабодная Германія", прэзідэнтам "Саюза нямецкіх афіцэраў". У 1950—1955 гадах знаходзіўся ў зняволенні ў Новачаркаскай турме. А пасля вызвалення зноў трапіў за краты. На гэты раз — на радзіме. Прычым абвінавачаны быў у дзейнасці на карысць... СССР.

Зараз вядзецца падрыхтоўка да працы над фільмам. Кінарэжысёр А.Алай шукае тых, хто сустракаўся з героем яго фільма. А.Алай спадзяецца, што новая стужка дапаможа раскрыць яшчэ адну старонку ў гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

КАБ ЗАБЫЦЦА ПРА ПРАБЛЕМЫ

Цудоўны спосаб псіхалагічнай разгрузкі і адпачынку знайшлі ў інтэрнаце Мінскага завода халадзільнікаў. Тут сістэматычна праводзяцца розныя цікавыя мерапрыемствы. Так, зусім нядаўна тут прайшоў конкурс кулінараў. Для пераможцаў былі падрыхтаваны цудоўныя прызы — разнастайны посуд.

Ірына МАСЛЯНІЦЫНА

ПНЗ ПРАВОДЗІЦЬ, АНАЛІЗУЕ, ПАТРАБУЕ...

Заўтра, 18 чэрвеня, адбудзецца канферэнцыя Партыі народнай згоды. Гэтае мерапрыемства ставіць перад сабой мэту аформіць новыя партыйныя структуры, што ўзніклі ў ходзе збору подпісаў за вылучэнне лідэра партыі Генадзя Карпенкі кандыдатам у прэзідэнты Рэспублікі Беларусь. На канферэнцыі плануецца правесці аналіз палітычнай сітуацыі ў рэспубліцы і выпрацаваць пазіцыю партыі, якую яна зойме на выбарах.

Франц ЛЯВІЦКІ,"ЦГ"

У ПОЛЬШЧУ НА... АДПАЧЫНАК

Першага чэрвеня 1500 беларускіх дзяцей, што пацярпелі ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС, на 39 аўтобусах накіраваліся ў Польшчу. Усе яны будуць адпачываць бясплатна ў польскіх сем"ях. Такая магчымасць з"явілася дзякуючы намаганням польскай арганізацыі "Катырас", якая ўзяла ўсе выдаткі на сябе. У гэтай справе "Катырас" супрацоўнічае з Гомельскім камітэтам "Дзецям Чарнобаля", Міністэрствам адукацыі, Дзяржкамчарнобылем і архібіскупам, Мітрапалітам Мінска-Магілёўскім Казімірам Свентакам.

Мікола БАГАДЗЯЖ

ВАШ ВЫБОР

ЧЕЛОВЕК ОТ ЗЕМЛИ



"Кто способен вывести страну из кризиса - те, кто превратил Верховный Совет в четырехлетнюю говорильню, или те, кто реально уберег от разрухи основу народного хозяйства, реформировал ее и вывел на новый этап развития на благо тружеников города и села?"

Александр ДУБКО

С кандидатом в президенты Александром Дубко беседует корреспондент Лариса Ключникова.

Александр Иосифович ДУБКО – человек, прославленный на весь мир и в то же время малозаметный сегодня из-за пестрой и крикливой толпы политиков и демагогов,заполонивших телевизоры и прессу. А.Дубко–председатель Союза Аграрников Беларуси и Совета Колхозов республики – в последние два года все свои силы отдает черновой работе по спасению сельского хозяйства. Аграрникам удалось пока не позволить запустить поля осотом и крапивой, перерезать скот, уморить голодом престарелых. Примером жизнестойкости и сопротивления служат Вертелишки, где по-прежнему хозяйствует А.Дубко. Колхозники не отпустили его "на повышение" и сохранили жизнь сложного агропромышленного организма.

А.Дубко – хозяин и политик, не побоявшийся – на весь мир! – потребовать на съезде в Москве отставки Горбачева и голосовавший за его смещение. А.Дубко открыто заявил, что аграрники Беларуси не позволят развалить жизнестойкие хозяйства, отстаивая свои права вплоть до политических акций. В то же время он не допустил забастовок сельхозсектора, чтобы народ Беларуси не голодал.

– В республике еще не принято официальное обращение. "Товарищ" еще не ушло, а "господин" еще не привилось. Как бы Вы хотели, чтобы к Вам обращались?

- Всегда буду рад услышать, что через годы-лихолетья у меня сохранились товарищи. Хочу, чтобы детские голоса меня звали дедушкой. Надеюсь дожить до титула прадеда. Спадар – это что-то от примаков или паробков (батраков). По-белорусски солидного человека называли "гаспадаром". Господин? Слишком отчужденно, и в историческом, и в бытовом самосознании.

– Что такое в Вашем понимании коллективная собственность? Где есть в мире аналоги? Каков механизм разделения этой собственности?

– Тема для диссертантов. Любителей теории отсылаю в монастырь, где коллективная собственность складывалась веками. А проще всего -- приезжайте в Вертелишки.

– Став президентом, Вам придется присутствовать на различного рода дипломатических приемах, соблюдать "придворный" этикет. Возникнут ли у Вас в связи с этим проблемы?

– Нет. Основа всякой школы этикета – быть самим собой.

– Кто из политических деятелей Беларуси Вам наиболее импонирует?

– Машеров Петр Миронович.

– Если Вы победите на выборах, сохраните ли кресло премьера за В.Кебичем?

– Пока об этом не думал. А с Вами порассуждаем. Скажу я "да", Вячеслав Францевич, как человек воспитанный, вынужден будет предложить этот пост мне. Зачем тогда тратить миллиарды народных денег на выборы?

– Могут ли Беларуси в ближайшее время угрожать интервенцией?

– Я, по крайней мере, войну объявлять не думаю. Белорусы тысячелетней историей доказали, что им чужого не надо, а захватчиков ждет земля-партизанка. Об этом свидетельствуют, кстати, и юбилейные даты: июль 44-го, май 45-го.

– Какой Вы видите военную доктрину Беларуси?

- Ответил в предыдущем абзаце. Если надо сказать наукообразно, то повторю: нейтралитет, минимум мобильной армии, всеобщее вооружение против агрессора.

– Крестили ли Вы своих детей? Делали это открыто?

– Нет. Был и такой народный обычай. А разве я похож на человека, делающего что-то трусливо?

– С какого указа Вы начнете свое президентство?

- "Каждый мужчина обязан зарабатывать столько, чтобы содержать жену и четверых детей, построить дом и купить машину". А если серьезно, то первыми будут не указы а распоряжения: об организации черновой повседневной работы, о создании временных научно-творческих коллективов, о системе публичного контроля за исполнением управленческих решений.

– Любите ли вы классическую музыку? Если да, то какой автор и его произведение Вам больше всего нравится?

– Григ, Шопен.

– Если станете президентом, обещаете ли первое интервью мне?

– Обещаю. У вас будет полгода, по крайней мере, для подготовки вопросов. Государственный деятель не суперзвезда. Пока незачем и красоваться.

ОДНА СУДЬБА



"Приходится часто бывать в различных уголках бывшего Союза. На фоне развала и морального упадка остается только удивляться тому, что у нас в Беларуси в домах остается мир, свет, тепло... хоть какое-то благополучие. При всей критике Правительства, все-таки в этом заслуга Кебича. Он сильный, волевой человек".

Игорь ЛУЧЕНОК

Кандидат в президенты Республики Беларусь Вячеслав Кебич отвечает на вопросы главного редактора "Цэнтральнай газеты"

В.Ф.Кебич родился в небольшой деревне под Воложином. Воспитывался в крестьянской семье. В 1953 году закончил политехнический институт в Минске. Учился серьезно, ответственно. Окончил институт с отличием.

Работал на Минском заводе автоматических линий, где вырос от инженера-технолога до заместителя главного инженера. С 1973 - главный инженер, затем - директор Минского станкостроительного завода имени Кирова. В.Ф.Кебич стал одним из самых молодых генеральных директоров крупных предприятий в Союзе ССР, назначенный П.Машеровым. За 2 года завод из отстающих стал передовым.

С 1985 г. В.Ф.Кебич - заместитель Председателя Совета Министров Беларуси. С 1990 г. - Председатель Совета Министров Беларуси.

В.Ф.Кебич - известный государственный и политический деятель, кандидат экономических наук, академик международной инженерной академии, лауреат государственных премий СССР. Имеет государственные награды.

- Вячеслав Францевич, долгое время Беларусь считалась благополучной республикой в широком смысле этого понимания. Сегодня мы ощущаем совершенно противоположное.

Все последние годы наше правительство возглавляли Вы. С учетом объективных причин и последствий развала было ли возможно избежать той тяжелой ситуации в экономике, политике, социальной сфере, в которой оказалась республика?

- Беларусь и сегодня, при всей сложности происходящего, не упала до уровня безысходности. Варианты смягчения всегда есть, но избежать полностью спада производства, а соответственно, и жизненного уровня людей, было невозможно. Слишком велик и целенаправлен был удар от разрыва многолетних связей с другими республиками, действий национал-сепаратистских сил, в программной логике которых преобладают тенденции разрушения, а не созидания, не разумных преобразований с учетом сложившихся реальностей, возможностей страны и желаний народа, а эйфория крушения всего и вся.

Вспомните, на чем строились и строятся, с небольшой маскировкой, программные цели некоторых сегодняшних кандидатов в президенты - до конца разрушить любой союз с бывшими республиками и, прежде всего, с Россией, насадить национализм, разрушить колхозы, рассорить армию и народ, интеллигенцию и правительство и т.п. Вот только народ должен задуматься - как Беларусь будет построена на подобном каркасе идей и целей?

- Как вы думаете, что привлекает избирателей в Ваших конкурентах?

- Я даю избирателям понимание и предсказуемость того, как будем жить дальше. Мои оппоненты, судя по их высказываниям, пока не могут дать ничего, кроме розовых надежд. А они, как известно, всегда привлекательны, и надеяться всегда намного слаще, чем понимать.

- У меня складывается впечатление, что в основу многих выступлений нынешних кандидатов в президенты и их команд положена цель - разгромить В.Кебича, а дальше - будь что будет. Может быть, это игра на болевых точках народа с помощью известного лозунга "Бей верхи и заживем лучше!"? Что Вы думаете по этому поводу?

- В предвыборной борьбе всегда стараются выйти сильнейшими. Если на меня нападают больше других, значит, меня считают самым серьезным претендентом. Кроме того, здесь присутствует простая житейская истина: обвинять легко, созидать труднее. Кого же еще критиковать, как не правительство и меня, коль скоро мы оказались в эпицентре событий государственного, экономического и политического разлома последних лет. По существу, основными жертвами этого разлома стал народ и работающее в этот период правительство. В этой связи мои критиканствующие оппоненты, по разным причинам не находя точку опоры в понимании сложностей хозяйственной жизни и политики государства, основываются на выпячивании ошибок, поиске компромата на реально работающую структуру, каковой и является правительство.

Они чем-то напоминают мне муху на роге пашущего вола, жужжащую про то, что он пашет неправильно, с огрехами. Известно, что у того, кто не пашет, огрехов нет.

- Скажите, пожалуйста, что наиболее тревожит премьер-министра В.Кебича? На что направлены его основные усилия?

- Тревожат не до конца увязанные нити перевода экономики республики от кризисного состояния к ее подъему, а соответственно, к повышению жизненного уровня людей, их безопасности в материальном, духовном и правовом состоянии.

В моей программе, как кандидата в президенты Республики Беларусь, определены узловые точки деятельности, при условии избрания на этот пост. В них взаимосвязаны реальное видение перспектив развития Беларуси с интересами страны, интересами белорусских людей, желанием подавляющего большинства создать прекрасные условия жизни, не переступая при этом грань, за которой лежит борьба, раздор, неприязнь, антагонизм на экономической, духовной и национальной почве.

Механизм, подбор людей, использование внешних и внутренних факторов, необходимых для ее выполнения, четко определит пути вывода страны из кризиса и ее подъема с учетом обязанностей, человеческой порядочности и ответственности высших должностных лиц государства перед своим народом.

- "Цэнтральная газета" взяла ориентир на защиту людей труда - рабочего, хлебороба, ученого, творческого человека, предпринимателя "с человеческим лицом". Мы намерены отстаивать принципы социальной справедливости. Есть такие принципы и в Вашей избирательной программе. На какие политические силы Вы опираетесь, на чью поддержку рассчитываете?

- Наши принципы не расходятся. Я, похоже, могу рассчитывать на поддержку читателей Вашей газеты, надеюсь на поддержку всех политических сил республики, наших белорусских людей, которые, перенося трудности дня нынешнего, верят в лучшее будущее и надеются его достичь не через рекламные ролики обещаний, а наш совместный труд с твердыми точками опоры на экономические и духовные силы всего белорусского народа.

- Как Вы относитесь к освещению своей предвыборной кампании в средствах массовой информации?

- Пока больше освещалась моя работа как Председателя Совета Министров. Считаю это нормальным. В предвыборной кампании я больше сторонник живого общения с народом. Категорически против, чтобы мои официальные информационные предвыборные материалы прерывали художественные фильмы.

Если это есть, то кому-то, по разным причинам, очень хочется вызвать у избирателя раздражение "образом Кебича". В средствах массовой информации, в ходе предвыборной кампании я выступаю как кандидат в президенты республики, а не как некая "звезда экрана". Впрочем, как и все остальные претенденты на президентский пост.

- Находите ли вы время для своей семьи? Как семья влияет на личную и государственную жизнь премьер-министра и претендента на высшую должность в республике?

- Как для любого нормального человека, мне дорога и близка моя семья. К сожалению, государственная работа не позволяет уделять ей много времени. Но мне помогают не забывать о ней некоторые мои "доброжелатели", усердно перенося на нее мерзости своих намерений - любым способом вышибить Кебича, как говорится, "из седла". Жена и дети прекрасно понимают желание отдельных грезящих вползти в большую политику через замочную скважину и искренне им сочувствуют. Своим же добрым отношением ко мне семья помогает снимать многие жизненные заботы. Это и есть ее главная помощь в моей государственной деятельности.

Желаю всем читателям "Цэнтральнай газеты" жизненного счастья, благополучия, душевного спокойствия и уверенности в завтрашнем дне.

БОЛЬ

ЖИВА ЛИ ПАМЯТЬ?

Афганистан... Прошло уже пять лет с тех пор, как закончился этот кошмар. Но все равно слово это отдает горечью и болью, запахом пороха такой неизвестной нам и такой близкой войны. Казалось бы, вихрь истории, что закружил и бросил нашу страну на скалы, разбив ее на куски, должен был покрыть забвением разыгравшиеся к югу от Амударьи события.

Что, впрочем, и произошло. Все реже и реже коллеги по перу напоминают нам об этой войне. А не так давно эта тема была ключевой. Но так у нас принято: поговорили и разошлись. Кто-то на этом сделал деньги, кто-то — карьеру. Конечно, почему бы не воспользоваться чужой бедой ради собственного благополучия. Но Афганистан нельзя забыть.

Слишком много крови пролито, слишком много вопросов остается пока без ответа. Как можно вычеркнуть из памяти 760 белорусов, сложивших головы на такой далекой, раскаленной солнцем и огнем войны земле? Как можно забыть длинный ряд могил на Чижовском кладбище? Скорбный ряд. Страшный и жестокий. Он проходит через сердца матерей, двадцатилетних вдов и юных невест. Проходит он и через наши сердца. 760 убитых, 433 покалеченных белорусских хлопцев. Немногих эти цифры оставят равнодушными. А сколько тех, кто выжил в этом аду, остался физически здоров и очутился наедине со своими переживаниями, проблемами, вопросами...

Недавно я встретилась с председателем Ассоциации ветеранов войны в Афганистане "Память" Владимиром Евгеньевичем Ероховцом.

Небольшой уютный кабинет, вопреки ожиданию, не располагал к разговору: со стороны моего собеседника постоянно чувствовалась какая-то настороженность, недоверие не то к представителям прессы, не то ко всем людям в целом. И действительно, какое тут доверие, если часто приходится читать материалы, в которых авторы слезливо рисуют вернувшихся из Афганистана как раздавленное, потерянное, пропащее поколение. Да, одних война закаляет, других ломает, но все же... Проблемы есть у всех, и эти парни не являются исключением.

Представьте, у многих "афганцев" нет квартир, не хватает хороших реабилитационных центров.

— Мы этого, конечно, не требуем, но ведь не сами же "афганцы" придумали льготы. Мы хотим, как все люди, работать, иметь семью, любить и быть любимыми. Однако "афганцу" часто бывает трудно устроиться на работу. С такими проблемами сталкиваются здоровые, а куда же тогда деваться калекам?

Да, эти ребята действительно заслужили право жить по-человечески. Прошедшие через преисподнюю необъявленной войны, они вынуждены сражаться и здесь — вместе со всеми бороться, чтобы выжить.

— У нас в Минске, — продолжает Владимир Евгеньевич, — около 170 инвалидов. И с каждым годом их становится все больше и больше. Среди 5 тысяч "афганцев" около 50 процентов не обеспечены жильем, 30 процентов — безработные.

Слышу эти цифры и думаю: а всего-то белорусских "афганцев" 16 тысяч плюс почти 500 покалеченных — да для них давно уже должно быть все сделано! И становится стыдно за наше руководство, которое не может обеспечить опаленных войной парней самым необходимым.

И почему-то в моей памяти всплыли другие цифры, не касающиеся напрямую афганской темы: около полусотни наших земляков воюют в республиках Закавказья и Средней Азии. Кажется, совсем недавно эти самые ребята сражались в одном отряде, а теперь они стреляют друг в друга. Что это? Снова политическая ошибка? Хотелось бы верить, что это не так. Память Афгана еще слишком свежа, чтобы повторить ее.

Анна СУСЛОВА



ГРЫМАСЫ РЭФОРМ

ФАРГЕЛЕТ

Некалі, у хрушчоўскі час, да нас у вёску прыехаў з раёна лектар прачытаць лекцыю. У клуб прыйшло некалькі калгаснікаў, найбольш старых дзядоў, каб паслухаць разумнага, як яны думалі, чалавека. Лектар доўга распінаўся на трыбуне, сыпаў фактамі і лічбамі, заклікаў сеяць кукурузу на палетках, балотах і нават на сотках, каб дагнаць і перагнаць Амерыку па надоях малака.

Нарэшце, ён закончыў сваю гаварыльню і кінуў позірк на дзядоў:

— Пытанні ёсць?

— Ёсць адно, — падняўся з пярэдняй лаўкі дзед Нічыпар. — Скажы, начальнік, што значыць слова "фаргелет"?

Лектар ад нечаканага пытання разгубіўся:

— Што- што вы сказалі?

— Растлумачце мне слова "фаргелет", — настойваў дзед.

— Не ведаю, — пачырванеў, аж успацеў, лектар. — Дзе ты, дзед, такое слова пачуў і падчапіў. Замежнае яно нейкае. Чужое. Капіталістычнае.

— Не пачуў яго, а ўбачыў, — пачаў расказваць Нічыпар. — Паехаў я летась у горад да сына. Заехаў і пайшоў на пошту, каб адбіць старой тэлеграму. Маўляў, я ўжо ў горадзе, на месцы, і нічога кепскага ў дарозе са мною не здарылася. Пераступіў парог гэтай пошты і бачу на шкляных дзвярах, за якімі пасылаюць тэлеграмы, напісана: "Тэлеграф". Заходжу за гэтыя шкляныя дзверы, зіркаю на іх з другога боку і бачу другое слова на шкле дзвярэй "фаргелет". Дык што ж значыць гэтае другое слова, начальнік? Растлумачце мне, — наступаў дзед.

Лектар зусім разгубіўся.

— Не ведаеш! — узрадаваўся Нічыпар, што загнаў сваім пытаннем у кут раённага начальніка. — А я вось ведаю. Гэта ж тое самае слова "телеграф", толькі чытаць яго трэба наадварот, не з пачатку, — з канца, ззаду.

Усе ў клубе зайшліся ад рогату.

Нядаўна ў яшчэ горшае становішча, чым той раённы лектар, трапіў і я.

Неяк у нядзелю, калі я вярта-ўся з дзяжурства, завітаў да мяне ў кватэру сусед і кажа:

— Ты адукаваны чалавек, журналіст. Растлумач мне, што значаць словы "Прэс-Х", "Сілікон", "Імпэкс", "Бомар", "Пульсар" і "Антарэкс".

Доўга я думаў, ламаў галаву. І адказу не знайшоў.

— Не ведаю, — прызнаўся яму і спытаў:

— Дзе ты, сусед, такіх слоў нахапаўся? Замежныя нейкія.

— Ха! — узрадаваўся ён, што мяне падкузьміў. — Не замежныя яны, а нашыя, маладзечанскія. У нас выдуманыя. Пойдзем у горад, і я пакажу табе іх.

І мы пайшлі. Наблізіліся да гастранома N 8. Да яго прытуліўся з боку гарадскога парку кіёск, падобны на шпакоўню. Гэта малое прадпрыемства, у якім прадаюць марожанае. Аздабляе яго шыльда "Сілікон".

— Ну, растлумач, што азначае гэта назва? — насядаў на мяне сусед. — Можа, гэта не "Сілікон", а "Сілівон"? Ёсць непадалёку ад Маладзечна вёска Сілівонаўка? Пачаў я чытаць гэтую шыльду і так, і гэтак, спераду і ззаду. Загадка, рэбус адным словам! Нават у слоўніку замежных тэрмінаў не сустракаў такога.

— Не ведаю! — пацiскаю плячыма.

— Давай, — параіў сусед, — у гаспадара будкі спытаем.

Усунуў я галаву ў акенца шпакоўні. Там, у прыцемку, малады круглатвары чалавек папыхваў дарагой цыгарэтай.

Пытаюся:

— Дзе вы ўзялі назву для прадпрыемства?

Дзяцюк тыцнуў пальцам у столь:

— У небе!

Во, выяўляецца, камерсанты карыстаюцца касмічнай мовай, а мы не ведаем і дудзім пра беларускую!..

Рушылі далей, спыніліся яшчэ каля двух кіёскаў. Чытаем: "Імпэкс", "Антарэкс". Паўглядаўся я то ў адну шыльду, то ў другую, ажно закружылася галава ад напругі — не магу даўмецца: ці адна гэта назва, ці іх дзве? Злілося ў вачах, задваілася. Пытаюся ў прадаўшчыц:

— Што азначаюць словы?

Маўкліва пацiскаюць плячыма.

Пайшлі мы далей горадам, на вуліцу Прытыцкага. Там гэтых кіёскаў, што ластаўчыных гнёздаў. У адных кветкі прадаюць, у іншых — гарэлку, віно, цыгарэты.

Падыходзім да "Бомара". Белакосая камерсантка-прадаўшчыца таксама не можа растлумачыць сэнс хітрага слова.

Кажу тады:

— Добры гаспадар пасаромеўся б так свайго сабаку назваць.

Смяецца. Маўляў, хай хоць гаршком завуць, абы ў печ не стаўлялі.

Вяртаемся дамоў з падарожжа. Сусед усё падколвае мяне:

— Ну, што, грамацей, пасадзіў я цябе ў галёш.

Маўчу. І раптам згадваю дзеда Нічыпара з нашай вёскі, які "зрэзаў" у тыя далёкія гады ў клубе лектара з раёна. Шкада, што дзед памёр. Вось бы была пацеха, калі б ён цяпер прайшоўся горадам ды прачытаў усе гэтыя шыльды. Тады б ён па веданні мовы паклаў бы на лапаткі не тое, што раённага лектара, але ўсіх сусветнавядомых акадэмікаў-мовазнаўцаў.

Мікола КАПЫЛОВІЧ, Маладзечна

Дайце слова!

ХТО ВЫПІЎ ГАРЭЛКУ І З'ЕЎ НАША САЛА?

Працуеш, працуеш --- а куды ўсё падзяецца? Спяваюць: "не ўмеем працаваць". Магчыма, тыя, хто так гаворыць, --- і сапраўды не ўмеюць. А вы б, хлопцы-дэпутаты, прачнуліся хаця б аднойчы раней, гадзін у шэсць, праехаліся б у гарадскім транспарце. Ды паглядзелі б на нас, рабацяг, якія --- ужо раніцай! --- стомленыя ў нас твары. Угледзьцеся, угледзьцеся... У вочы жанчын, у якіх пануе штодзённы страх: чым карміць сям'ю? У азлобленыя твары мужыкоў нашых --- угледзьцеся! А мы ж толькі едзем на працу!..

Але ж вы ў гэты час яшчэ салодка спіце. Сесіі вашы, на якіх вы будзеце абмяркоўваць нашы лёсы, пачынаюцца пазненька. Выспаўшыся, добра паснедаўшы, вы паспееце на свае няспешныя пасяджэнні, дзе будзеце красамоўна абмяркоўваць: як бы гэта нас навучыць працаваць "цывілізавана"?

Мы для асобных з вас, мабыць, "саўкі", "чэрнь", "п'янь". І ўсё ж вы вымушаны гуляць з намі ў народаўладдзе, велікадушна даваць нам "пагаласаваць". Толькі калі мы галасуем за свой кавалак хлеба, вы незадаволены. Да вашага абурэння, мы не разумеем вашых "узвышаных" мэтаў, галадухі, у якую вы нас кінулі. Добра, аддзяліліся. Паліва проста так ужо ніхто не дае. Ёлкі-палкі, вы нібыта гэтага і чакалі, для вас гэта зрабілася апраўданнем вашай кіраўнічай імпатэнцыі --- як раней для вас быў апраўданнем "уціск Масквы". Дык вы ж не можаце, і ніколі не маглі, не зневажацца перад кімсьці, не кланяцца! Раней кланяліся, прабачце, маскоўскім чынушам, зараз --- замежным. А нам усе вушы прагудзелі пра нацыянальную годнасць, якой няма ў народа. Прабачце --- гэта ў вас яе не было і няма! Вы ўжо і зараз кроку не можаце зрабіць без усялякіх замежных кансультантаў, ездзіце да іх --- са справаздачамі. Навучылі яны вас вырошчваць бульбу, гадаваць свіней? Не навучылі і не навучаць. Толькі таму навучаць, што сала нашага, беларускага, якога раней было заваліся, зусім не стане. Прывязеце вы нам, адчуваю, хутка амерыканскае сала з дзесяціразовымі накруткамі.

Ні мой дзед, ні мой прадзед на адсутнасць паліва не скардзіліся. Аралі на конях. І хапала сала і мяса, і бульбы. Справа тут не ў адсутнасці паліва, а ў дэфіцыце кемлівасці.

Прыязджае сваяк з калгаса, заходзіць у краму. Каўбаса, якая зроблена з калгаснага мяса, каштуе ў дзесяць разоў даражэй, чым было ўплочана за мяса калгасу. Хто ж так ліха "накруціў", ці не вы? А вы --- спакойна абмяркоўваеце "складанае становішча". І працягваеце папракаць нас, што "развучыліся працаваць".

Добра, што мы самі пакуль з грахом напалам сябе салам і бульбай забяспечваем, ездзім да радні ў вёску. І будзем забяспечваць --- быў бы кавалак зямлі. Дык вы ж яго не даяце. Нас --- на нашу ж зямлю! --- ставіце ў чаргу на дзесяць гадоў. На маленькі ўчастак для бульбы. Самі ж сябе і прыбліжаных надзяляеце гектарамі ў маляўнічых месцах. І асобныя з вас пасля ўсяго гэтага лічаць сябе народнай уладай?

Так, яшчэ апраўданне: мы самі сваё дабро вывозім. Раней --- у Польшчу, цяпер --- у Піцер і ў Маскву. Вось гэта самае дзіўнае --- людзі з торбамі пасля працы ажыццяўляюць "знешнеэканамічную палітыку". Надрываючы пупкі. Дык калі гэта выгадна --- чаму б не ажыццяўляць гандаль на дзяржаўным узроўні? А можа вам не да таго? --- вы ж дзеліце крэслы, а заадно ўладжваеце свае справы: крэслы вам дазваляюць. Атрымліваецца, што мы працуем на сваіх месцах --- за сябе. Ды яшчэ і за вас. Вы ж толькі гаварыльняй займаецеся, ды той-сёй стараецца паболей хапануць.

Пры гэтым якраз тыя, хто корміць рэспубліку, атрымліваюць менш за ўсіх. Колькі атрымліваюць сяляне --- і называць сорамна. Не ў лепшым становішчы і рабацягі-заводчыкі. Жыруюць банкіры, жыруюць кіраўнікі, жыруюць спекулянты --- перапрадаючы працоўнаму люду яго ж прадукцыю ўтрая даражэй. І ўлада пры гэтым разводзіць рукамі. Ды вы, спадары, проста не жадаеце і пальцам паварушыць, каб паправіць становішча. А мо наша дабро ў створанай вамі сітуацыі асядае ў вашых кішэнях?..

Нават паглядзець цікава: была адна наменклатура. Дзеткі гэтых босаў падраслі --- зрабіліся "апазіцыяй". Пераселі з бацькоўскіх персанальных "Волг" у дэмакратычныя "Мерседэсы". І "косяць" пад клапатнікоў народных. Робяць выгляд, што ваююць паміж сабой, --- за шчасце для нас, рабацяг. Хітра закручана, га? Гэты бессаромны, наменклатурны варыянт праблемы бацькоў і дзяцей мы назіраем на кожным кроку. Раней таты падвозілі сваіх сынкоў да школ на "Волгах", зараз гэтыя сынкі адкрываюць для сваіх дзяцей элітарныя платныя школы, куды простае дзіця і блізка не падпускаюць. І ўсё гэта хапае нахабства называць "дэмакратыяй"?! Агідна на ўсё гэта глядзець. На народнай беларускай мове нават навучыліся размаўляць --- каб знешне быць бліжэй да народа.

Ды толькі каго вы хочаце ашукаць? Народ, які нюхам адчувае фальш, чытае ашуканства нават не ў вашых словах --- а на вашых выглянцаваных тварах.

Як і старой наменклатуры, так і новай "франтавой", "дэмакратычнай", "народнай" патрэбна адзінае --- на нашых карках пракаціцца ў наменклатурны рай. Ці не падобна гэта, браткі, на просты здзек? Паны б'юцца, а ў мужыкоў чубы трашчаць. Заўсёды так было. Ды ці б'юцца яны? Мо толькі выгляд робяць? Вы глянце: Вярхоўны Савет, у якім, здаецца, "партбальшавіцкая большасць" --- а выдае "Народную газету" у духу... сваёй палітычнай "апазіцыі". А мо гэта пацвярджае, што наменклатура і апазіцыя зрасліся? Зрабіліся двухадзінай наменклатурнай апазіцыяй да народа?..

Што ж нам у такім выпадку, рабацягам, простаму народу, рабіць? Нічога не застаецца, як самім арганізоўвацца. Прыйдзецца, калі хочам выжыць. Інакш давядуць жа нас, давядуць да ручкі. Трэба варушыцца. І згуртоўвацца ў сваю кроўную партыю працы і справядлівасці. Якая, дарэчы, ужо існуе. Мы павінны не дазволіць --- і не дазволім --- паводзіць сябе з намі, як з маўклівай жывёлай, якая можа знесці ўсё. Вы нас называеце "саўкамі", "чэрнню"? Але сапраўдная чэрнь --- тыя, хто толькі і здольны жыць за кошт іншых, не працуючы, а толькі пераразмяркоўваючы. І мы, аб'яднаўшыся ў сваю ўсеагульную партыю працы і справядлівасці, гэта дакажам. Мы ўмеем працаваць. І таму хочам нармальнага жыцця. Мы маем на тое права. Нам няшмат трэба --- каб мы маглі апрануцца і паесці, накарміць сем'і. І каб на свята было што наліць у чаркі --- не прывознае дарагое пойла, а сваё, якое лепш і танней. І каб не думалі з жахам, што чакае заўтра, што яшчэ "выкінуць" кіраўнікі і "апазіцыя". У гарачцы дзеляжу ці мала што стукне ў галаву.

Нам шмат не трэба. Але апошняга --- не аддамо. Так і запомніце, панове!

Васіль ПЯТРОШ, прыхільнік партыі працы і справядлівасці

МЫ СВАІХ ГАДУЕМ ДЫСІДЭНТАЎ...

Мы атрымалі ліст. "Чуў, што некалькі пісьменнікаў нядаўна былі выключаны з творчага саюза за іншадумства. Няўжо такое магчыма сёння? Раскажыце падрабязней пра рэпрэсіраваных. Думаю, гэта цікавіць не толькі мяне. А.В.Янчэўскі".

Адразу хочам заспакоіць аўтара працытаваных слоў, а таксама іншых чытачоў - паэты Віктар Трасцянскі і Вячаслаў Дашкевіч (гаворка ідзе менавіта пра іх) жывыя і здаровыя, нават не пакінулі сваю зямлю. Хоць, напэўна, настрой маюць не самы лепшы. Пісьменніцкая Рада сапраўды нядаўна выключыла іх з творчага саюза. Здарылася вось што. У час апошняга пісьменніцкага з'езда прымаўся зварот да народа, сэнс якога зводзіўся да сцвярджэння аб немэтазгоднасці ўваходжання Беларусі ў рублёвую зону з Расіяй.

Паколькі заява прымалася пры сумніцельным кворуме і без падліку галасоў, шэраг пісьменнікаў узняў пытанне аб перагаласаванні. Сярод тых, хто хацеў выказаць думку на гэты конт, былі В.Трасцянскі і В.Дашкевіч. Але іх пазбавілі слова. Паэты ў знак пратэсту паклалі на стол прэзідыума пісьменніцкія пасведчанні. Затое адразу атрымаў слова З.Пазьняк, не член Саюза.

Гэты выпадак даў падставы на чарговым пасяджэнні Рады, як паведаміла газета "Советская Белоруссия" 4 чэрвеня г.г., па прапанове намесніка міністра культуры і друку Г.Бураўкіна выключыць двух паэтаў з Саюза пісьменнікаў Беларусі. Наколькі гэта дэмакратычна і справядліва, мяркуйце самі, шаноўныя чытачы. "Цэнтральная газета" папранейшаму лічыць Віктара Трасцянскага і Вячаслава Дашкевіча нашымі адметнымі паэтамі, пра што сведчыць сённяшняя сустрэча з імі.

ВИКТОР ТРОСТЯНСКИЙ

Виктор Тростянский пятнадцатилетним подростком ушел из детского дома на фронт. Закончил войну командиром батальона морской пехоты. Стихи В.Тростянского во многом автобиографичны, подкупают честностью, прямотой. В них осмысливается пережитое, фронтовые дороги, сегодняшний день.

Виктор Степанович - автор поэтических сборников "Расстрелянные листья" (Молодая гвардия, 1975 г.), "Далеко от войны" (Советский писатель, 1980 г.), "Расстояния и расставания" (Современник, 1983 г.), "Дальние дороги, дальние..." (Мастацкая літаратура, 1981 г.) и др.

Недавно Виктор Тростянский завершил работу над первой книгой романа "Тонкий серп месяца", в которой повествует о Великой Отечественной войне, о ратном, трудовом подвиге нашего народа в то трагическое время.

